мышленности; имели место проблемы с первоначальным накоплением капитала; преобладали мелкие предприятия, расположенные в основном в сельской местности и местечках, где использовался принудительный труд крестьян; промышленность специализировалась на переработке местного сырья; развитию крупной фабричной индустрии препятствовала конкуренция со стороны российской и польской промышленности.

ЛИТЕРАТУРА

1. Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т.4. Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XУ111-пачатак XX ст./ М. Біч і інш. Мн.: Экаперспектыва. 2007. – 519 с.
2. Экономическая история зарубежных стран/ Под ред. Голубовича В. И. Мн.: Экоперспектива. 2002. – 592 с.
3. Ермашкевич Г. И. Экономическая история зарубежных стран и России. Мн.: ТетраСистемс. 2005. – 304 с.

УДК 930.85(476)

## БЕЛАРУСКАЯ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА ВІЛЬНІ

**Банцэвіч П. К.**

УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

«У Еўропе няшмат гарадоў, якія б падпадалі пад такую міфалагізацыю, як Вільня. Пад міфалагізацыямі я маю на ўвазе гістарычныя легенды, неабавязкова адпаведныя фактам. Легенды змяняліся ў залежнасці ад таго, хто іх апавядаў: літоўцы ці палякі, яўрэі ці беларусы», – пісаў у сваім эсэ польскі літаратар Ч. Мілаш.

Ужо больш, чым за два дзесяцігоддзі беларускія інтэлектуалы вырашаюць задачу, як вярнуць сучасным беларусам страчаную духоўную спадчыну Вільні. На паліцах віленскіх кнігарняў прадстаўлены шматлікія дапаможнікі па гораду на розных мовах, аднак за гэтыя гады так і не з'явіўся даступны гід па Вільні для нашых турыстаў па-беларуску. Як вынік, сярэднестатыстычны беларускі турыст найперш скіроўваецца ў «Akropolis» ці ў «Maxima». Беларуская Вільня яго не цікавіць, бо ён пра яе нічога не ведае.

Да беларускай гісторыка-культурнай спадчыны Вільні, якую трэба ведаць сучасным беларусам, можна аднесці архітэктурныя помнікі, храмы, палацы, гістарычныя будынкі ды мясціны.

Вострая Брама уяўляе сабою браму гарадской сцяны, якая захавалася з 16 ст., і капліцу з цудадзейным абразам Маці Божай Вастраб-



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

рамскай, Маці Міласэрнасці, якую лічаць святой як каталікі, так і праваслаўныя, беларусы, палякі, літоўцы.

Друкарня Ф.Скарыны – шыльда на будынку 15-16 ст.ст., які належаў бурмістру Я. Бабічу, сведчыць аб тым, што сюды ў 1520 г. Ф. Скарына перавёз з Прагі сваю друкарню. Тут і былі надрукаваныя «Малая падарожная кніжка» (1522 г.) і «Апостал» (1525 г.). Віленскі універсітэт – адна са старэйшых ВНУ Еўропы. У 1570 г. на базе парафіяльнай школы езуіты заснавалі ў Вільні калегіум, разлічаны на 160 навучэнцаў. Пасля скасавання Ордэну езуітаў Віленская акадэмія стала Галоўнай школай ВКЛ. У часы Расійскай імперыі – Імператарскім Віленскім універсітэтам. У Польшчы часоў Пілсудскага – Універсітэтам С. Баторыя, а ў незалежнай Літве – Vilniaus Universitetas. У бібліятэцы ўніверсітэта захоўваецца арыгінал скарынавай Бібліі.

«Базыльянскія муры» – гэта комплекс Базыльянскага (уніяцкага) кляштара, які ўтвараюць царква Св. Троіцы, званіца, будынкі жаночага і мужчынскага кляштараў, Паўночная і Паўдзённая брамы і бурса. У 1-й пал. 20 ст. тут знаходзіліся беларуская бібліятэка, Віленская беларуская гімназія, дзве беларускія пачатковыя школы, Беларускае навуковае таварыства, Беларускі нацыянальны камітэт, Беларускія настаўніцкія курсы, Беларуская школьная рада Віленшчыны, духоўная семінарыя Святатраецкай царквы, Беларускі музей імя І. Луцкевіча. У музеі захоўваліся сярэднявечныя пячаткі, манеты, слуцкія паясы, прадметы этнаграфіі, галаснікі Гарадзенскай Каложскай царквы, рукапісныя кнігі і старадрукі (выданні Ф. Скарыны, татарскі Аль-Кітаб, Літоўскі Статут 1588 г.). Паводле інвентара 1941 г. музей налічваў 13 450 адзінак. Архіў музея зберагаў дакументы ад 18-га ст. да сярэдзіны 20-га (звыш 9000 адзінак). Бібліятэка налічвала звыш 14 000 тамоў.

Могілкі Росы. Былі заснаваны ў 1801 г. Тут знайшлі апошні прытулак знакамітыя дзеячы беларускай культуры: І. Луцкевіч, палітык, гісторык, археолаг, выдавец; А. Луцкевіч, гісторык, публіцыст; Ф. Аляхновіч, драматург, публіцыст; Ядвігін Ш., літаратар; Я. Тышкевіч, археолаг, гісторык, этнограф; К. Сваяк, паэт, рэлігійны дзеяч; Я. Лялевель, гісторык, прафесар Віленскага універсітэта, удзельнік паўстання 1831 г.; У. Сыракомля, паэт, перакладчык і інш.

В. Вастрабрамская № 1 – месцілася беларуская кнігарня (з 1926 г.); № 6 – Беларускі інстытут гаспадаркі (з 1926 г.); № 7-b – Царква Св. Троіцы; № 10 – Царква Св. Духу. В. Каралеўская № 3 – Жыў і памёр У. Сыракомля. Знаходзіўся беларускі банк (з 1932 г.). В. Бернардзінская № 11 – Дом-музей А. Міцкевіча. Пр-т Гедыміна

№ 2 – Беларускае выдавецкае таварыства «Наша хата». Пры мясцовай бібліятэцы працаваў Я. Купала. Падчас фашысцкай акупацыі дзейнічаў Беларускі нацыянальны камітэт. В. Універсітэцкая № 4 - Друкарня М. Кухты. Там быў выдадзены адзіны прыжыццёвы зборнік М. Багдановіча «Вянок». Таксама ў Кухты друкавалася газета «Наша Ніва», творы Ф. Багушэвіча, Цёткі, Я. Коласа. В. Піўная № 13 – Беларускі пасольскі клуб. В. Вялікая № 33 – Дом Залкінда, дзе выйшлі першыя чатыры нумары «Нашай Долі». В. Нямецкая № 26 – Дом, дзе жыў С. Манюшка. В. Дамініканская № 8 – Касцёл Св. Духу і Дамініканскі кляштар з шыльдай К.Каліноўскаму. Лукішская плошча – Крыж памяці К. Каліноўскага і З. Серакоўскага. В. Св. Ганны № 2 – Беларускі народны дом (да 1930 г.). Беларуская настаўніцкая семінарыя імя Ф. Багушэвіча; Помнік А. Міцкевічу; № 13 – Дом, дзе з 1928 па 1939 гг. жыў Р. Шырма. В. Завальная № 11 – музей А. Міцкевіча. В. Малая Пагулянка № 51 – рэдакцыя «Нашай Нівы» на пачатку 1907 г.; № 26 – рэдакцыя з траўня 1907 г., акруговы суд, дзе працаваў Ф.Багушэвіч. В. Віленская № 10 – Бібліятэка «Знание» (з 1911 г.). Знаходзілася кватэра Луцкевічаў – цэнтр беларускага нацыянальнага адраджэння; № 14 – Рэдакцыя «НН» у 1914-15гг.; Беларускі клуб. Шыльда Я. Купалу; № 21 – Адрас першай рэдакцыі «Нашай Долі»; № 30 – Помнік С. Манюшку; № 37 – Жыў Б. Тарашкевіч (1923-1926 гг.); № 41 – Беларускі банк і рэдакцыі.

ЛІТАРАТУРА

1. Дубавец С. “Вільня. Анталогія беларускай паэзіі XX ст.” // ARCHE. -2003. - №5. – С.7 - 12.
2. .Луцкевіч Л “Вандроўкі па Вільні” / Л.Луцкевіч . – Вільня: “Рунь”, 1998. – 218 с.
3. К.Лашкевіч. Страчаная сталіца. Дапаможнік-гід па беларускай Вільні / Лашкевіч К. - http://news.tut.by/culture/144187.html

УДК 378.661.9(091)(476)

## КРАТКИЙ ИСТОРИЧЕСКИЙ ОЧЕРК РАЗВИТИЯ КАФЕДРЫ ПЛОДООВОЩЕВОДСТВА И ЛУГОВОДСТВА УО «ГГАУ»

**Бруйло А.С.**
УО «Гродненский государственный аграрный университет»
г. Гродно, Республика Беларусь

Кафедра плодоовощеводства и луговодства образована из состава кафедры растениеводства 10 августа 1971 г. Свое первоначальное название она сохранила до сих пор. 1 сентября 2007 г. на ее базе была организована кафедра технологии хранения и переработки раститель-



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ